**2025 г. - 85 гадоў з часу стварэння Кобрынскага раённага спажывецкага таварыства (1940)**

На падставе Устава раённага Саюза спажывецкіх таварыстваў, зацверджанага Пастановай Прэзідыума Цэнтрасаюза, у 1940 годзе быў створаны Кобрынскі раённы саюз спажывецкіх таварыстваў, у задачы якога ўваходзіла арганізацыя кааператыўнага гандлю. У гэтых мэтах Кобрынскі райспажыўсаюз арганізаваў на тэрыторыі свайго раёна Тэвельскае, Жухавецкае, Лепясоўскае, Залескае, Пескаўскае спажывецкія таварыствы.

У перыяд Вялікай Айчыннай вайны райспажыўсаюз спыніў сваю дзейнасць і аднавіў яе ў 1944 годзе пасля вызвалення тэрыторыі Кобрынскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Першым старшынёй праўлення пасля вайны быў Дзмітрый Андрэевіч Мікулінскі (1949-1953). Першыя магазіны пабудаваны ў 1948 годзе ў в. Стрыі, у 1950 годзе - у в. Яромічы, у 1955 годзе - у в. Астромічы.

З кожным годам паляпшалася матэрыяльная база. У 1980 годзе ў складзе райспажыўсаюза былі пяць спажывецкіх таварыстваў, нарыхтоўчая кантора, аб'яднанне грамадскага харчавання. Рознічны гандаль ажыццяўлялі 168 магазінаў. У райспажыўсаюзе працавалі 910 чалавек.

У гісторыі арганізацыі былі і ўзлёты, і падзенні, але заўсёды спажыўкааперацыя займала годнае месца ў эканамічнай сістэме раёна і аблспаўжыўтаварыства. Кобрынскае раённае спажывецкае таварыства ў адпаведнасці з рэаліямі своечасова распрацоўвала і рэалізоўвала мерапрыемствы па аптымізацыі сваёй дзейнасці, укараняла новыя падыходы і свежыя ідэі ў гандлі і грамадскім харчаванні.

У час падрыхтоўкі да рэспубліканскага фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2009» праводзіліся маштабныя мерапрыемствы па рэканструкцыі і будаўніцтву аб’ектаў райспажыўсаюза. У 2019 годзе вялікая ўвага надавалася мадэрнізацыі гандлёвых кропак у горадзе і раёне. Так, быў зроблены рамонт у кавярнях «Каменная кветка», крамах «Няміга», у аграгарадку Дзівін. Быў закуплены адзін (усяго іх дзейнічае пяць) аўтамагазін.

Прадпрыемства аб'ядноўвае ў сабе шэраг галін. На сённяшні дзень Кобрынскае райспажыўтаварыства – гэта 73

магазіна, большая частка якіх знаходзіцца ў сельскіх населеных пунктах, у т. л. і аддаленых ад раённага цэнтра. У склад таварыства ўваходзіць філіял «Дзівінскі». Сфера грамадскага харчавання прадстаўлена дзевяццю стацыянарнымі прадпрыемствамі. У вытворчай галіне працуюць пяць халадзільных камер, скотазабойны пункт, пякарня па выпуску хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў у філіяле «Дзівінскі», у асартыменце якой звыш 60 найменняў. Дзівінская пякарня, як адзіная вытворчасць, стала своеасаблівай візітнай карткай райспажыўтаварыства. У нарыхтоўчай галіне функцыянуюць склад другаснай сыравіны, пяць прыёмных пунктаў. Працуюць два рынкі, размеркавальны склад. У аказанні паслуг задзейнічаны больш за 360 чалавек.

Пра станоўчыя вынікі дзейнасці Кобрынскага райспажыўтаварыства гавораць узнагароды прадпрыемства. Калектыў неаднаразова займаў прызавыя месцы не толькі ў раёне, але і ў вобласці і рэспубліцы. У гісторыю арганізацыі залатымі літарамі ўпісаны імёны лепшых працаўнікоў, дзевяць з якіх адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі СССР, восем – граматамі Вярхоўнага Савета БССР, пяць – медалямі «За працоўную доблесць», 43 – знакам «Выдатнік спажывецкай кааперацыі». З 2014 года старшынёй Кобрынскага райспажыўтаварыства з’яўляецца Валерый Уладзіміравіч Карнялюк.

85 гадоў Кобрынскае раённае спажывецкае таварыства, якое ўваходзіць зараз у склад Брэсцкага аблспажыўсаюза, з'яўляецца важным звяном эканомікі раёна і забяспечвае насельніцтва неабходнымі таварамі і паслугамі.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2025 г. Кобрынскай раённай
цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна,
бібліёграф I кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Потребительская** кооперация Белорусской ССР. – Минск : “Ураджай”, 1988. – 144 с.

См. на с. 34, 65.

**Кобрынскаму** раённаму спажывецкаму таварыству (1940) – 85 гадоў // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная

бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 191.

**Белов, Д.** Кобринскому райпо – 85 лет / текст и фото Дмитрия Белова // Кобрынскі веснік. - 2025. - 5 ліпеня (№ 27). - С. 7 : фот.

**Бакун, Е.** За качество и профессионализм / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2024. — 6 ліпеня (№ 27). — С. 6 : фот.

Ведущий юристконсульт Кобринского райпо Елена Горегляд удостоена почетного звания "Человек года" в номинации "Лучший юрист".

**Бакун, Е**. Именинский "Родны кут" / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2023. — 11 лютага (№ 11). — С. 4 : фот.

Магазин Кобринского райпо открылся в д. Именин Кобринского района.

**Белов, Д.** На контроле депутатов — потребительский рынок страны / Дмитрий Белов ; фото: Александра Соловей // Кобрынскі веснік. - 2023. — 19 красавіка (№ 29). — С. 3 : фот.

Депутат Палаты представителей Национального собрания РБ Василий Демидович посетил торговые объекты Кобринского райпо.

**Бакун, Е.** Будни кооператоров / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2022. — 2 ліпеня (№ 49). — С. 9 : фот.

О работе Кобринского районного потребительского общества по рассказу председателя правления Валерия Корнелюка.

**Елизарова, Ж.** Залог успеха — добросовестный труд / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2021. — 2 ліпеня (№ 52). — С. 4 : фот.

Кобринское районное потребительское общество вносит весомый вклад в развитие инфраструктуры района.

**Оскирко, И**. В автомагазине – самообслуживание, или новинка в райпо / Иван Оскирко // Кобрынскі веснік. – 2020. – 25 лістапада. – С. 4.

Кобринское райпо приобрело новый современный атомагазин.

**Елизарова, Ж.** Если нет торговли, то не будет и благ / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2019. — 6 ліпеня. — С. 3 : фот.

Потребительская кооперация — важное звено экономики Кобринского района.

**Елизарова, Ж.** Всю жизнь работаю в райпо! / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2018. — 4 красавіка. — С. 1.

Специалист и мастер своего дела в потребкооперации — И. Микитюк.

**Дубина, Л**. Заботясь о людях / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2017. — 1 ліпеня. — С. 3.

История Кобринского районного потребительского общества имеет немало интересных страниц.

**Ніжнік, Н.** Прарыў павінен быць / Наталля Ніжнік ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2015.— 8 ліпеня. — С. 4.

Аб гісторыі і сённяшнім дні спажывецкай кааперацыі раёна, якой споўнілася 75 гадоў.

**Казакова, А.** Потребкооперация - во благо людей / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2015. — 2 июля. — С. 5.

Из истории потребкооперации района и праздновании 75-летия организации.

**Ніжнік, Н.** Прадавец - гэта яшчэ і псіхолаг / Наталля Ніжнік ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2015. — 2 ліпеня. — С. 4.

Алена Кабрынец, прадавец магазіна "Родны кут" в. Залессе, удзельнічала ў абласным конкурсе "Лепшы па прафесіі" і заняла 4-е месца.

**Корнелюк, В**. Потребкооперация во всех уголках Кобринщины / [Валерий Корнелюк ; беседовала ] Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2014. — 17 апреля.— С. 2.

**Казакова, А.** «Родны кут» теперь в Залесье / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2013. — 12 сентября. — С. 3.

В Залесье открыся новый магазин Кобринского райпо.

**Мельнік, Р**. Дзякуюць за працу людзі / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2013. — 6 ліпеня.— С. 2.

Добрыя ўражанні застаюцца ад наведвання магазіна № 26 Кобрынскага распажыўтаварыства ў в. Стрыгава.

**Мельнік, Р.** Іх паважаюць і чакаюць / Раман Мельнік ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2013. — 25 мая. — С. 2.

Прадавец аўтамагазіна Кобрынскага райспажыўтаварыства І. Копцава і вадзіцель А. Краўчук прафесійна абслугоўваюць вясковых пакупнікоў.

**Перчанка, А**. "Дастаўляем тавар і ў аддаленыя вёскі" / Андрэй Перчанка ; [гутарыў] Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2013. — 17 красавіка. — С. 3.

Кобрынскае раённае спажывецкае таварыства ў адпаведнасці з рэаліямі рэалізуе мерапрыемствы па аптымізацыі сваёй дзейнасці.

**Перченко, А**. Конкурировать сложно, но можно / Андрей Перченко ; [беседовала] Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. - 2013. — 21 ноября. — С. 2.

Председатель районного потребительского общества А. Перченко рассказывает о том, какие проблемы на сегодняшний день решаются в организации.

**Макарэвіч, І.** Насустрач спажыўцу / Ірына Макарэвіч ; [гутарыў] Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2012. – 7 ліпеня. - С. 2.

Аб тым, чым жыве спажывецкая каапeрацыя на Кобрыншчыне, расказала нам. старшыні раённага спажывецкага таварыства І. Макарэвіч.

**Свірыдовіч, В.** Кобрынскі прарыў / Вольга Свірыдовіч, Ніна Леанавец // Народная трыбуна. - 2012. - 13 красавіка. - С. 8, 9.

Насуперак усім цяжкасцям кобрынскія кааперетары ўкараняюць новыя падыходы і свежыя ідэі ў гандлі і грамадскім харчаванні.

**Курец, А.** Цены - на 20 процентов ниже / Александр Курец // Белорусская нива. - 2011. - 16 декабря. - С. 3.

Магазины Кобринского райпо в предверии Нового года установили скидки на широкий перечень товаров.

**Макарчук, Ю.** Кобринское райпо: поверить в свои силы / Юрий Макарчук // Заря. - 2011. - 22 октября. - С. 8.

**Гром, А.** Всегда на стороне потребителей / Анна Гром // Кобрынскі веснік. - 2011. - 2 ліпеня. - С. 4.

**Воевчик, Л. Г.** Шаг в будущее / Л. Г. Воевчик ; [беседовала] Наталья Васюк // Кобрин-информ. - 2010. – 4 марта. - С. 2.

Кобринскому райпо – 70 лет.

**Веремеенко, С.** Кооперация Кобринщины укрепляет свои позиции / Светлана Веремеенко // Кобрин-информ. - 2010. - 1 июля. - С. 3.

**Перченко, А. Н**. Райпо не выживает - оно живет / Андрей Николаевич Перченко ; [беседовала] Жанна Елизарова // Кобрин-информ. - 2010. – 18 ноября. - С. 2.

**Воевчик, Л. Г.** Большие надежды районной кооперации / Л. Г. Воевчик ; [беседовала] Наталья Васюк // Кобрин-информ. - 2009. - 2 июля. - С. 3.

О делах и планах потребительской кооперации рассказала председатель Кообринского райпо Л. Г. Воевчик.

**Германович, Г.** Социально-экономические основы и предпосылки развития потребительской кооперации / Геннадий Германович // Аграрная экономика. - 2009. - № 3. - С. 35-45.

Организационная структура потребкооперации, в т. ч. Кобринского райпо.

**Васюк, Н**. "24 часа": задача - работать достойно / Наталья Васюк // Кобрин-информ. - 2007. - 24 мая. – С. 2.

О работе Кобринского райпо.

**Васюк, Н.** Райпо сегодня и завтра / Наталья Васюк // Кобрин-информ. – 2006. – 6 июля. – С. 3.

**Карпук, Н. Н**. Новые проекты райпо / Н. Н. Карпук // Кобрин-информ. – 2006. – 23 ноября. – С. 2.

**Хільчук, М.** Спажывецкае таварыства: здабыткі і задачы / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2004. – 31 сакавіка. – С. 1-2.

**Хільчук, М.** Шлях да выжывання – рэфарміраванне / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2003. – 25 студзеня. – С. 2.

Дзейнасць кіраўніцтва раённага спажывецкага таварыства ў мінулым годзе, планы на будучыню.

**Румко, У.** Насустрач сельскаму пакупніку : [Кобрынскі райспажыўсаюз] / У. Румко // Камуністычная праца. – 1985. – 6 ліпеня.

**Микула, В. А**. Нет ответственней задачи / В. А. Микула // Сельское хозяйство Белоруссии. – 1983. - № 8. – С. 43.

О кооператорах Кобринского района.

**Румко, У.** Абслугоўваем сельскіх пакупнікоў : [Кобрынскі райспажыўсаюз] / У. Румко // Камуністычная праца. – 1981. – 5 лютага.

***Рэгіён:***

Кобрынскі раён

Кобрын

***Установы:***

Кобрынскае райспажыўтаварыства

***Прадметы:***

Спажывецкая кааперацыя